# Бясконца кружыцца планета Куляшова





**У МДУ імя А.А. Куляшова падвялі вынікі адкрытага літаратурнага конкурсу «І кружыцца планета Куляшова», які праводзіла Магілёўскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі сумесна з універсітэтам**

Ролю мадэратараў на ім выконвалі кіраўнік абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі **Алесь Казека** і прарэктар па вучэбнай рабоце універсітэта, член Саюза пісьменнікаў Беларусі **Уладзімір Ясеў**, які ўзначальваў журы.

Пачалося свята з песні Ігара Лучанка на словы Аркадзя Куляшова «Алеся», якую выканаў вакальны ансамбль «Дети Поднебесной» – кітайскія студэнты МДУ.

Дзясяткі творцаў усіх узростаў прадставілі свае творы ў намінацыях «И вечность строки как вечность жизни», «Ад шчасця сэрца скача, як дзіця», «Ёсць у паэта свой аблог цалінны...». Добрых твораў, на погляд Уладзіміра Ясева, аказалася нямала – іх аўтары былі ўзнагароджаны ганаровымі граматамі.

– Універсітэцкі конкурс за некалькі гадоў перарос у рэспубліканскае і міжнароднае мерапрыемства, таму што ў гэтым годзе былі ўдзельнікі з Данецкай Народнай Рэспублікі і Іашкар-Алы, – адзначыў Алесь Казека.

Конкурс «І кружыцца планета Куляшова» праводзіцца з мэтай папулярызацыі беларускай культуры сярод моладзі, прыцягнення ўвагі да літаратурнай спадчыны народнага паэта, а таксама для пошуку і развіцця творчага патэнцыялу пачынаючых літаратараў.

**Аліна КАЖУРА.** *Фота аўтара.*